**Гулевіч С.Л.** студэнт

Навуковы кіраўнік – Аляхновіч А.М.

## ТРАНСФАРМАЦЫЯ СВЯТОЧНЫХ ДЗЕЙ ВЯЛІКДНЯ Ў ГОРАДЗЕ

Нашы продкі спраўлялі свята вялікага дня – Вялікдзень – урачыста, узнёсла, з вялікім творчым патэнцыялам. В.Д. Ліцьвінка вызначае наступным чынам касмічную і міфалагічную сутнасць свята: ―Паводле народнага павер'я на Вялікдзень, і як і на Купалле сонца ―грае", або ―купаецца", а абрады і звычаі былі звязаны з узвялічаннем палявых духаў, з падрыхтоўкай да пачатку веснавых работ" [4, с. 66].

На сёняшні дзень многія традыцыі не толькі зніклі з актыўнага бытавання, але і забыты людзьмі. Функцыі некаторых з іх зменшаны або трансфармаваны. Прычыны гэтаму даволі разнастайныя: дэмаграфічныя змены, урбанізацыя, развіццё сродкаў масавай інфармацыі і шэраг іншых. У той жа час ў жывым бытаванні і сёння існуюць традыцыі, якія ўплываюць на паўсядзённы і святочны побыт беларусаў, рэгламентуюць, хоць і не так строга, лад жыцця, правядзенне каляндарных і сямейных абрадаў.

У горадзе, ў адрозненні ад вескі, гледачы пастаянна змяняюцца, яны бываюць рознага ўзросту і прафесійнага прызначэння. Свята ўсе больш набывае ігравую форму, што садзейнічае знікненню перашкод паміж выканаўцамі і гледачамі, апошнія далучаюцца да сцэнічнай дзеі. Усе больш увагі накіроўваецца на тое, каб зрабіць свята больш відовішчным, дзякуючы распрацаваным мезансцэнам, прыгожым касцюмам, новым тэхнічным сродкам уздеяння на гледача.

Сапраўды, змены ў сучасным жыцці гарадскога насельніцтва кожны раз ставяць перад рэжысёрам задачы, якія патрабуюць новых творчых вырашэнняў.

АсноваЙ пошукаў рэжысера з'яуляюцца традыцыі, у якіх ён знаходзіць новыя магчымасці для наватарскіх ідэй. На аснове традыцый фарміруюцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

новыя элементы, якія могуць з'явіцца зыходнымі элементамі навацыі. Аднак новае не павінна ўзнікнуць на руінах старога, якое рушыцца без асаблівага асэнсавання. Традыцыя павінна ўспрымацца як аснова, зыходны пункт, база, на якой будуюцца новыя перспектыўныя культурныя адкрыцці, узмоцненыя запасам ведаў і практычным вопытам мінулых пакаленняў.

Для асэнсавання Вялікдня і пераноса яго на гарадскія пляцоўкі рэжысёру неабходна вызначыць тыя элементы традыцыі, якія найбольш адпавядаюць умовам гарадскога жыцця. На наш погляд, лепшым мастацкім сродкам з'яўляецца выкананне веснавога карагода. Ён аб'ядноўвае людзей, нягледзячы на іх розны сацыяльны статус, узрост, пол [1].

Карагод – сінкрэтычнае адзінства песні з пластычным і гульнявым суправаджэннем. Карагод уяўляўся беларусу заўсёды актам калектыўнай творчасці і весялосці. Карагодныя спевы і гульні выконвалі важную ролю кансалідацыі калектыўных намаганняў. Беларусы казалі: *калі не спявалі, то і не весяліліся, раз не было песень, то не было і вяселля*. Перавага аддавалася калектыўным спевам: *пець добра разам, а гаварыць па чарзе*. Лічылася, што танчыць павінен умець кожны.

Карагод у горадзе прадаўжае вясковую традыцыю яго бытавання, калі быў вядомы звычай ―затанцоўваць" вясну, што ажыццяўлялі дзяўчаты, рухаючыся па вёсцы і выконваючы веснавыя песні і карагоды (Г.А. Барташэвіч). Адносіны людзей да веснавога карагода яскрава адлюстравалася ў прыказках: *хоць бяда ў камяніцах, абы гоў на вуліцы, часам плачам, часам скачам*.

Дарэчы, пра Вялікдзень у народзе гавораць: *свята Вялічка – з красным яічкам*. Яйка – вельмі важны атрыбут велікодных дзён. Яно сімвализуе сусветную прастору, галактыку, а таксама кругазварот і бясконцасць жыцця, пачатак адраджэння.

Рабілі яйкі – пісанкі, таксама іх называлі яшчэ маляванкі, крашанкі. Найбольш пашыраны спосаб аздаблення – васкаванне. Яйка з папярэдне нанесеным спецыяльнай бляшанай леечкай, шпількай, цвіком васкавым узорам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фарбавалі ў растворы. На каляровым фоне атрымоўваўся белы узор. Шырока бытавала звычайная суцэльная расфарбоўка.

Гэта традыцыя, як элемент сацыяльнай і культурнай спадчыны, што перадаецца ад пакалення да пакалення і захоўваецца ў пэўных сацыяльных групах і класах, на працягу доўгага часу ахоплівае аб‘екты сацыяльнай спадчыны (матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці), працэсы і спосабы атрымання сацыяльных норм, захавалася і па сенняшні дзень. На наш погляд, у горадзе, у межах Вялікадня, мэтазгодна праводзіць своеасаблівае свята яек, у якім галоўным атрыбутам будзе яйка.

Можна пачынаць свята Вялікдзень з паказу тэтралізаванага прадстаўлення –Хаджэнне валачобнікаў”. Рэжысёр можа распрацаваць сцэнарый гэтага прадстаўлення на аснове валачобных песень, якія ўтрымліваюць персанажы: бацька, маці, сын, дачка і самі валачобнікі. Валачобныя песні лёгка падлягаюць пры дапамозе прыёмаў тэатралізацыі, яны знаёмяць гараджан з прыгожай традыцыяй беларусаў, у якой адбіліся іх характэрныя нацыянальныя рысы. У гэтай частцы свята рэжысёр можа арганізаваць конкурс творчых калектываў на лепшую тэатралізацыю святочных велікодных дзён, далучыць да ўдзелу дзяцей гарадской царквы ў абрадавых дзеях.

Такім чынам, пры правядзенні свята ва ўмовах горада неабходна выкарыстоўвать такія традыцыі, якія найбольш адпавядаюць нашым сенняшнім патрабаванням эстэтыкі жыцця і святапогляду народа.

Што тычыцца свята Вялікдзень, то ў гарадскіх умовах, на наш погляд, неабходна ўзнауляць тры кампаненты, якія прадаўжаюць традыцыю: па-першае, падрыхтоўка тэатралізаванага прадстўалення па матывах валачобных песень; па-другое, ваджэнне веснавых карагодаў з удзелам гледачоў, што дазваляе далучыць іх да творчасці і пераадолець межы паміж выканаўцамі і гледачамі; па-трэццяе, правядзенне гульні ў яйкі з выкарыстаннем цэлага комплекса мерапрыемстваў - фарбаванне яек, выраб пісанак, конкурсы на выяўленне лепшых з іх, біткі ў яйкі і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пры гэтым яйка сімвалізуе вечны кругаварот жыцця, яго ўзнаўлення. Зразумела, што ў горадзе, пры ўзнаўленні святочнай традыцыі, не магчыма абыйсціся без увасаблення разнастайных прыёмаў і метадаў, такіх як рэстаўрацыя, рэканструкцыя, стылізацыя і інш. Сучасныя тэхнічныя сродкі могуць шырока выкарыстоўвацца ў сучасным святе Вялікдзень, напрыклад, мультымедыйны экран, у якім дэманструюцца дызайны афармлення яек, прыгатаванне велікодных страў і інш.

---

1. Беларуская вусна-паэтычная творчасць: Падручнік для студэнтаў філал. спец. ВНУ / К.П,Кабашникаў, А.С.Ліс, А.С.Фядосік і інш. – Мн. : Лексіс, 2000. – 512 с.

2. Веснавыя песні / Скл. Г.А.Барташэвіч і інш.– Мн. : БелЭн, 1979 – 342 с.

3. Ліс А.С. Валачобныя песні. – Мн. : Навука, 1989. – 231 с.

4. Ліцьвінка В.Д. Святы і абрады беларусаў, 1998. – 89 с.

**Гурбо О.В.,** студент

Научный руководитель – Стельмах А.М.

## РАЗВИТИЕ ЧАСТНЫХ РЕГИОНАЛЬНЫХ МУЗЕЕВ В БЕЛАРУСИ

Республика Беларусь имеет богатое историческое и культурное наследие. Оно формировалось на протяжении веков и передавалось из поколения в поколение. Несмотря на разрушительные войны, стихийные бедствия, общество приумножало достижения предков, развивало науку, литературу, искусство, повышало свой культурно-образовательный и профессиональный уровень.

Совокупность материальных и духовных благ, созданных обществом, и есть национальное богатство. Для хранения, исследования и презентации этих

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ